# РУХ за свабоду

Бюлетэнь ПАГА «Рух »За Свабоду»   Выпуск №2-3 сакавік-красавік 2015 году



Дзень Волі па-нашаму - стар.2

«Народны рэферэндум»: адказы ўладаў - стар.8

Дзяржава для народа? - стар.12


# Менш крамлёўскай прапаганды!

**Рух «За Свабоду» прыняў заяву-прапанову датычна трансляцыі расійскіх тэлеканалаў. У ёй гаворыцца:**

«Апошнім часам расійскія тэлевізійныя каналы ператварыліся ў рупары неаімперскага мілітарысцкага рэваншызму. У выніку грамадзяне Беларусі, якія вымушаны існаваць у сацыяльна-культурніцкім і медыйным кантэксце немiралюбнай суседкі, становяцца ахвярамі пракрамлёўскай прапаганды. Прычым наша краіна можа ўслед за Украінай зазнаць парушэнне тэрытарыяльнай цэласнасці і нават страту суверэнітэту.

Акупацыі зазвычай папярэднічае інфармацыйная вайна. Яе разгортванне супраць Беларусі можна назіраць ужо цяпер.



Задача дзяржавы ў такіх варунках - зрабіць усё магчымае, каб мінімізаваць уздзеянне на грамадзян Беларусі плыняў вонкавай «гебельсаўшчыны».

Мы разумеем, што суцэльнае адключэнне расійскіх тэлеканалаў альбо іхняя кропкавая фільтрацыя з боку ўладаў Беларусі сёння малаверагодныя. Таму Рух «За Свабоду» заклікае кіраўніцтва краіны хаця б спыніць у дзяржаўных установах

**працяг на стар. 3**

# «Паход на выбары асобнымі калонамі дэзарыентуе прыхільнікаў пераменаў»

**Рада Руху «За Свабоду» са шкадаваннем канстатуе, што нават глыбокі эканамічны крызіс у Беларусі і пагроза для суверэнітэту краіны з боку Расіі не спрычыніліся да кансалідацыі дэмакратычных сілаў Беларусі ў імя незалежнасці, дэмакратыі, рынкавай эканомікі і еўрапейскага выбару.**

На вялікі жаль, брак адказнасці і дамоваздольнасці да сённяшнага дня не дазволілі прыняць працэдуру вызначэння адзінага кандыдата ў прэзідэнты ад дэмакратычных сілаў.

Лічым, што паход на выбары асобнымі калонамі дэзарыентуе прыхільнікаў пераменаў і паглыбіць апатыю ў грамадстве. Імітацыя ўдзелу ў выбарчым палітычным працэсе з загадзя прадказальным фіналам можа адштурхнуць людзей ад дэмакратычных сілаў.

Ад моманту стварэння Рух «За Свабоду» ставіў за мэту пашырэнне патрыятычных і праеўрапейскіх настрояў, фармаванне крытычнай масы грамадзянаў, якія ў стане рэальна адстаяць незалежнасць і дэмакратычны выбар Беларусі. Мы і надалей будзем дзейнічаць дзеля яе дасягнення, не абмяжоўваючыся рамкамі выбарчай кампаніі.

**Рух «За Свабоду» заяўляе, што ўстрымліваецца ад вылучэння свайго кандыдата і падтрымкі іншых кандыдатаў падчас прэзідэнцкай кампаніі 2015 году.**

Арганізацыя сканцэнтруецца на распрацоўцы прапановаў эканамічных рэформаў у рамках «Народнай праграмы», ініцыятыве дзеля мірных пераменаў «Народны рэферэндум», а таксама на кампаніях па назіранні за хадой выбараў і за вызваленне палітычных вязняў.

# Бел-чырвона-белы Дзень Волі

**25 сакавіка ў Мінску прайшла традыцыйная акцыя да Дня Волі – чарговых угодак абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі.**

Удзельнікі сабраліся на пляцоўцы каля кінатэатра «Кастрычнік», адкуль шэсцем у колькасці болей за тысячу чалавек рушылі ў бок парка Дружбы народаў. Меркаванага мітынгу пры канцы там не было: арганізатары заклікалі дэманстрантаў працягнуць свята замест слухання прамоваў адзначэннем ў барах і за сямейным сталом.







На месцы збору ўдзельнікаў акцыі актывісты Руху «За Свабоду» раздалі 500 бел-чырвона-белых стужак і 100 нацыянальных сцягоў. З улікам раздавання стужак напярэдадні акцыі ў офісе нашай арганізацыі ўсяго іх патрапіла да патрыётаў каля 1000.

Беларусы адзначылі Дзень Волі як след - па бел-чырвона-беламу!

Святкавалі і ў рэгіёнах. Напрыклад, у Горках актывісты Руху «За Свабоду» раздалі адмысловыя паштоўкі студэнтам сельгасакадэміі. Праўда, потым тыя паскардзіліся, што кіраўніцтва факультэтаў загадала паштоўкі здаць, пагражаючы праблемамі.



«Абвяшчэнне БНР – факт гісторыі. Як яго адмаўляць? Няхай студэнты ведаюць сваю гісторыю. Любая дзяржава зацікаўленая, каб у краіне жылі патрыёты», - кажа мясцовы актывіст Руху, сябра Рады арганізацыі Андрэй Юркоў.







# Менш крамлёўскай прапаганды! (працяг)

працяг ад стар. 1




самага рознага кшталту і грамадскіх месцах трансляцыю расійскіх тэлеканалаў, што з'яўляецца дастаткова распаўсюджанай з'явай. Пры наяўнасці значнай колькасці беларускіх тэлеканалаў падобную сітуацыю можна трактаваць як ідэалагічнае спрыянне вонкавай ваяўнічай прапагандзе, якая пагражае нацыянальным інтарэсам.

Разам з тым мы звяртаемся да ўладальнікаў прыватных установаў (ад цырульняў да кавярняў) выявіць незалежніцкую пазіцыю і не ладзіць публічных трансляцый расійскіх тэлеканалаў. Паважаючы права грамадзян Беларусі ў сваіх дамах і кватэрах глядзець з экранаў тэлевізараў што заўгодна на свой уласны выбар, заклікаем усіх тым не менш сцерагчыся пракрамлёўскай прамыўкі мазгоў. Гэта сапраўды небяспечна для нашых сем'яў і Беларусі!»

Заява выклікала дастаткова вялізны розгалас на форумах у беларускім, расійскім і ўкраінскім сегментах інтэрнэту. За некалькі гадзін на самым папулярным у нашай краіне партале Tut.by былі пакінутыя сотні розных каментароў. Сам партал падвёў вынікі дыскусіі ў сваёй рубрыцы «Голас народу».

**Публікуем тыповыя меркаванні з яе на мовах арыгіналу:**

**LetunDV** Полностью поддерживаю. Ограничить вещание российских телеканалов не только в общественных местах, а и во всей сетке вещания. Этого требуют интересы национальной безопасности Республики Беларусь. Кроме того, это отвечает и интересам правящей верхушки Беларуси - поскольку ни для кого не секрет, что основными поставщиками информации для населения РБ давно стали российские медиа. И смотрят белорусы на мир через призму интересов России, а не Беларуси.

**PanSportsmen** Движение «За Свободу» выступило против свободы информации.

**Жбанков_Михаил** Давно пора, народ у нас и так уже зомбирован российскими СМИ дальше некуда.

**shi-zhi_shi-zhi_talks36** Свобода быть несвободным. Можно еще потребовать «забанить» все российские сайты. И потребовать перестать слушать всех российских исполнителей. И потребовать перестать смотреть все российские фильмы. Кто хочет получать информацию - получает.

Даже родной «Белтелеком» по Zala транслирует европейский «Евроньюс», проамериканский RTVI, либеральный РБК, российские НТВ и РТР, эсэнговский «Мир», неисчислимые белорусские каналы. И пусть вещают. Надо, наоборот, выступать за большее количество каналов, а не требовать запрещать те, что есть. Пусть потребуют добавить CNN, BBC, «Интер» и пр. при сохранении всех российских.

**moytop** Российские СМИ наиболее объективные из тех, что я смотрел. «Евроньюс» или «Шустер Лайв» однозначно более пропагандистские.

**ZmicerRB** Забараняць не трэба. Перанесці вяшчанне на спадарожнік і кабельнае тэлебачанне. Іншае пытанне - ці здольна Беларускае тэлебачанне замяніць расійскі кантэнт.

**херр_майор** В принципе, они ничего плохого не предлагают. Ведь операторам кабельного ТВ запретили вещать украинские, польские ТВ-каналы. Вещать - так всех тогда или никого! Только БТ, только хардкор.

**alex_dorf_talks52** Любая идеологическая пропаганда в общественных местах должна быть ограничена, дома - смотри и слушай что хочешь.

**tut_on-13** Лично меня тоже коробит «украинская истерия» на российских телеканалах, но согласитесь, смешно выглядит просьба борцов за свободу что-то ограничить.

**ivanefimov** Я - за. Мне надоел поток лжи на российских телеканалах. Дома я новостные каналы просто игнорирую, но в общественных местах это сделать невозможно.



# «Демократические силы просто теряют время впустую»

**Заместитель председателя Движения «За свободу» Юрась Губаревич рассказал, какая организация и кто персонально оказался недоговороспособным в плане выдвижения единого кандидата от оппозиции, существует ли угроза развала «Народного референдума», и возможен ли бойкот выборов.**




2 апреля Движение «За Свободу» распространило заявление о том, что воздерживается от выдвижения своего кандидата и поддержки других кандидатов в президентской кампании 2015 года. В этой связи «Салідарнасць» задала несколько уточняющих вопросов Юрасю Губаевичу, чтобы прояснить позицию его организации.

**– В заявлении говорится: «Дефицит ответственности и договороспособности до сегодняшнего дня не позволили принять процедуру определения единого кандидата в президенты от демократических сил». Какая организация или кто персонально в наибольшей степени оказались недоговороспособными?**

– Это ситуация достаточно прозрачная. В прошлом году пять структур – Движение «За Свободу», партия БНФ, кампания «Говори правду», социал-демократы и БХД – из семи, которые участвовали в процессе обсуждения процедуры выдвижения единого кандидата, планировали её утвердить и провести Конгресс демократических сил, поставили свои подписи под процедурой и пригласили оставшиеся две структуры сделать то же самое. Но Объединенная гражданская партия и «Справедливый мир» не поставили свои подписи.

**– Выходит, ОГП и «Справедливый мир» продемонстрировали недоговороспособность?**

– Можно считать так. Мы вынесли на публичное обсуждение эту ситуацию и не оставляли попыток договориться, прийти к компромиссу.

Не так давно на одном из общих заседаний «семерки» Владимир Некляев вынес предложение об исключении из процедуры механизма выдвижения делегатов на Конгресс путем сбора подписей. Как известно из публичных заявлений ОГП и «Справедливого мира», именно этот механизм вызывал у них нежелание подписать общую процедуру.

Это предложение было адресовано Анатолию Лебедько, который присутствовал на встрече. Он пообещал в течение недели дать ответ, но до сегодняшнего времени мы не имеем от него публичного ответа: готов ли он в таком случае принять участие в Конгрессе, если будет сделана такая уступка?

**– Означает ли заявление Движения, что внутри «Народного референдума» также не удалось согласовать кандидатуру от коалиции на президентские выборы из-за «дефицита ответственности»?**

– «Народный референдум» не создавался для того, чтобы выдвинуть кандидата на президентские выборы. Мы заявляли об этом изначально.

Цель «Народного референдума» - иная. Это кампания, которая призвана объединить большинство людей в Беларуси вокруг идеи мирных перемен, в частности, проведения референдума по шести вопросам, которые вписаны нами в повестку дня.

Мы не приурочиваем эту кампанию к каким-либо выборам – будь то местные, президентские либо парламентские. Эти выборы используются как механизм по продвижению повестки «Народного референдума» до большего числа

граждан, используя возможности избирательной кампании.

Основная часть работы делается в межизбирательный период, в частности, это сбор подписей, проведение общественных слушаний, встречи с людьми. Мы делаем это каждый день, и Движение «За Свободу» продолжает это делать.

Насколько мне известно, по состоянию на сегодняшний день нет единой согласованной кандидатуры, на которую была бы возложена ответственность представлять идеи «Народного референдума» во время избирательной кампании.

Мы не давали оценку событиям внутри «Народного референдума». В своем заявлении говорили о едином кандидате от всей оппозиции. Мы изначально нацеливались на то, чтобы наше участие в обсуждении в рамках «семерки» завершилось избранием единого кандидата. Конечно, если бы таким кандидатом стала фигура, которая продвигает идеи «Народного референдума» – это был бы наилучший вариант. Потому что только таким образом можно было бы донести наше послание до большинства граждан Беларуси.

**– То, что единого кандидата, скорее всего, не будет, стало ясно уже давно. Почему «За Свободу» только сейчас вышло из процесса переговоров о выдвижении кандидата от коалиции «Народный референдум»? Почему Движение второй раз подряд, как и в 2010-м, фактически самоустраняется от участия в президентских выборах?**

– Тут два неправильных посыла. Мы до последнего надеялись и надеемся, что выдвижение единого кандидата будет возможным, если остальные политические силы смогут согласовать эту процедуру. В таком случае мы с удовольствием присоединимся. Это никак не будет противоречить нашему заявлению.

Что касается 2010 года, тут прослеживается последовательность нашей позиции. Когда мы готовились к участию в кампании в 2010 году, и Александр Милинкевич предлагал свою кандидатуру, одним из важных условий он выдвигал наличие единства в оппозиции по вопросу единого кандидата. Тогда мы долго обсуждали это с нашими партнерами. К сожалению, все это закончилось выдвижением девяти кандидатов.

> **«Мы видим, что все движется к тому, что единого кандидата не будет, а будет несколько кандидатов от разных политических сил**

В данный момент мы видим, что все движется к тому, что единого кандидата не будет, а будет несколько кандидатов от разных политических сил, поэтому мы решили отреагировать на эту ситуацию таким образом.

Время для этого могло быть выбрано другое. Сейчас можно это связать с тем, что была сделана очередная попытка – предложение Владимира Некляева Анатолию Лебедько. Вместо недели, которую брал на решение лидер ОГП, прошло более двух недель. И, наверное, уже настало время каким-то образом на это отреагировать.

До выборов остается не более полугода и нужно обозначать свою позицию, потому что мы видим, что демократические силы просто теряют время впустую.

**– В заявлении Движения «За Свободу» говорится о том, что «имитация участия в избирательном политическом процессе с заранее предсказуемым финалом может оттолкнуть людей от демократических сил». А если бы был единый кандидат, разве в сложившихся условиях финал не был бы «заранее предсказуемым»?**

– Я думаю, что он не был бы заранее предсказуемым. Следует опираться на данные социологии. По последним опросам НИСЭПИ, рейтинг Александра Лукашенко падает, и прослеживается определенная динамика. Если в прошлом году он стабильно рос за счет реакции общества на события в Украине, то теперь экономические проблемы дают о себе знать. Возможно и дальнейшее снижение рейтинга.

Если власти не найдут возможность задобрить избирателей перед днем голосования, они будут испытывать значительные трудности на выборах. Поэтому единый кандидат мог бы иметь сопоставимую поддержку с нынешним руководителем государства. Если таких кандидатов будет несколько, как на прошлых выборах, то естественно, говорить о каких-то шансах не приходится.

**– Почему если выборов фактически нет, Движение «За Свободу» намерено сконцентрироваться на наблюдении за ними?**

– О том, что выборов на сегодня нет, и они фальсифицируются, сегодня знает менее половины избирателей. От 60 до 70% опрошенных после выборов говорят, что, по их мнению, выборы прошли абсолютно без нарушений либо без значительных нарушений.

Если мы не участвуем в наблюдении за выборами и не предоставляем обществу конкретные факты этих нарушений и фальсификаций, говорить о том, что власть сама себя избрала незаконно, не приходится. Мы привыкли действовать не голословно, а опираясь на конкретные факты, которые мы собираемся получить во время кампании наблюдения за выборами.

**– Движение «За Свободу» заявляет, что воздерживается от выдвижения своего кандидата и поддержки других кандидатов в президентской кампании 2015 года. Означает ли это, что вы будете бойкотировать выборы?**

– Нет, не означает. Для того, чтобы инициировать бойкот выборов, должна быть определенная атмосфера в стране. Люди должны сами понимать, что участие в выборах нежелательно, и неучастием они могу высказать власти свой протест. Если опираться на социологические данные, сегодня более 60% опрошенных готовы принять участие в президентских выборах.

Также мы считаем, что во время избирательной кампании, даже в отсутствие единого кандидата, возможно доносить свое мнение избирателям. Это, конечно, худший вариант, чем единый кандидат, но то, что будет присутствовать несколько иных демократических кандидатов, позволит им высказать позиции своих структур и коалиций.

Мы не будем призывать к бойкоту выборов.

**– Означает ли это фактический развал коалиции «Народный референдум», раз Движение «За Свободу» объявляет, что не будет поддерживать никого, то есть в том числе кандидата, которого выдвинут его партнеры?**

– Нет, не означает. Мы не будем поддерживать никого и не будем выдвигать своего кандидата. Если в ближайшее время что-то изменится с выдвижением единого кандидата (в том числе и наше заявление повлияет на это), и оппозиция найдет в себе силы сесть за стол и продолжить переговоры и прийти к какому-либо результату, то наше участие будет активным.

Относительно коалиции (вернее, кампании «Народный референдум», слово «коалиция» мы не употребляем) это могло бы означать развал в одном случае: если бы мы изначально ставили единственной целью выдвижение кандидата на президентские выборы. Такой цели не было.

> **“Если власти не найдут возможность задобрить избирателей перед днем голосования, они будут испытывать значительные трудности на выборах. Поэтому единый кандидат мог бы иметь сопоставимую поддержку с нынешним руководителем государства.**

«Народный референдум» позиционируется как кампания работы с обществом. И выборы – это проходной элемент. Поэтому Движение «За Свободу» видит свою роль и дальше. В рамках кампании мы займемся общественной работой, встречами с людьми, разработкой реформ по вопросам референдума. Все это мы делаем, независимо от того, проходят в Беларуси выборы или нет.

Есть предварительная договоренность с коллегами, что мы можем координировать такие действия с теми субъектами, которые будут работать в кампании кандидата, если такой кандидат будет от «Народного референдума».

**– Будет ли Движение «За Свободу» помогать собирать подписи за выдвижение, например, Татьяны Короткевич?**

– По-моему, вопрос так не стоит. Выдвигаются разные кандидаты и вне «Народного референдума». Насколько мне известно, и партия БНФ заявляет о выдвижении своих кандидатов. На сегодняшний день наше отношение к кандидатам от разных структур отображено в нашем заявлении. Если Татьяна Короткевич или Рыгор Костусев пройдут процедуру избрания единым кандидатом, в этом случае мы рассмотрим возможность активного подключения к кампании.

В ином случае нам нужно дождаться появления кандидата от структур, которые занимаются определением кандидата в рамках «Народного референдума» и впоследствии определить форму координации между политической и неполитической частью кампании «Народный референдум». В данный момент мы готовы взять на себя ответственность за неполитическую часть кампании.

Не знаю, будет ли стоять вопрос об участии в сборе подписей. Это отдаленная перспектива. Мы готовы его обсуждать, но пока такого решения нет. Если кандидат будет избран единым, вероятность такого решения возрастает в разы.

**– То есть если Татьяна Короткевич или Рыгор Костусев не станут единым кандидатом, то Движение «За свободу» не собирает подписи в их поддержку?**

– Как и любого иного кандидата. Если будет процедура по выборам единого, не исключаем, что и от нашего движения может быть претендент.

# «Трэба настроіцца на стратэгічную працу»

**Заяву Руху “За Свабоду” аб устрыманні адносна вылучэння свайго кандыдата ў прэзідэнты і падтрымкі іншых у інтэрв’ю радыё “Рацыя” пракаментаваў старшыня арганізацыі Аляксандр Мілінкевіч:**



- Калі мы пачыналі ўдзельнічаць у працэсах дэмакратычнай кааліцыі, так званай „сямёркі”, то хацелі аднаго, каб апазіцыя кансалідавалася і быў абраны адзіны кандыдат. Чаму ён нам так патрэбны? Дакладней, не нам патрэбны, а Беларусі. Няма ў краіне рэальнай палітычнай канкурэнцыі, няма рэальнага падліку галасоў. Калі мы кажам, што людзі павінны ведаць, што ёсць альтэрнатыва, то гэта апазіцыйная дэмакратычная альтэрнатыва не ў растапырку павінна ісці рознымі калонамі, а павінна мець адзіны пазнавальны твар.

І ўсе ведалі б, што вось на гэтага чалавека паставілі дэмакраты. Акрамя таго, шчыра скажам, што разгром апазіцыі, які асабліва моцны быў пасля прэзідэнцкіх кампаній і наймацнейшы – у 2010 годзе, прывёў да таго, што ў яе зараз ёсць сілы толькі на адну сумесную прыстойную кампанію. А калі пойдзем паасобку, то гэта будуць слабыя кампаніі. Таму і трэба аб’ядначца...

Калі мы так вось не ўмеем аб’яднацца, то ў грамадстве ў час выбараў і асабліва ў дні пасля выбараў пачынаецца вялікае расчараванне, апатыя, дэпрэсія. А ці гэтага мы хочам дасягнуць? Мы штосці там пакажам, раскажам пра перамены, пра праграмы, а людзі будуць незадаволеныя, людзі не гэтага чакалі. І так у нас хапае песімізму ў Беларусі. Таму я лічу, што кансалідацыя і вылучэнне адзінага – гэта проста ўмова абавязковая. Будуць дэмакратычныя выбары, то абсалютна не патрэбен адзіны кандыдат. Калі дэмакратычныя выбары, то і левы можа быць, і правы. А ў другім туры хай вырашаецца лёс – хто стане прэзідэнтам.

Таму мы сапраўды засмучаны вельмі гэтым, але не заламываем рукі і не лічым, што скончылася жыццё ў Беларусі. І будзем займацца тым, што для нас асноўнае. Калі мы грамадскі рух, то мы зоймемся грамадскімі справамі. Яны таксама вельмі патрэбныя. Не толькі на выбарах можна змяняць сітуацыю і пераконваць поставецкіх людзей у Беларусі, што мы з еўрапейскай сям’і, што мы павінны рухацца ў той бок, захоўваючы адносіны з Расіяй, што мы павінны быць беларусамі, мець больш ідэнтычнасці, больш разумення гісторыі нашай. Працы вельмі многа. І не трэба думаць, што фокус выбараў у адзін цудоўны дзень, нават калі яны будуць сумленнымі, адразу вырашыць лёс Беларусі. Лёс Беларусі не ў руках апазіцыі, не ў руках Лукашэнкі, ён у руках народа і ў думках народа. І калі апазіцыя, калі грамадская думка будуць дэмакратычнай, беларускай, еўрапейскай, то і не будзе месца дыктатуры.

Я лічу, што трэба проста настроіцца на стратэгічную працу. Пройдуць дэмакратычныя выбары – усё роўна трэба з людзьмі працаваць, адразу яны ж не зменяцца. Вельмі доўгі час і дэнацыяналізацыя, і саветызацыя рабілі сваю справу. Таму працы многа, і трэба спакойна да гэтага ставіцца. І я лічу, што таксама трэба на ўладу перакласці адказнасць у пэўным сэнсе, каб яна не казала, ну вось бачыце: няма каго выбраць – на выбарах, на якіх яна не лічыць галасы. Таму ўлада нясе адказнасць за тое, што ёсць, і апазіцыя нясе. Я вельмі шкадую, што мы не змаглі кансалідавацца ўжо другі раз. У 2001 годзе быў адзіны кандыдат, у 2006 – быў. А зараз, як і ў 2010, – не.

# «Народны рэферэндум»: што адказвае ўлада?



**Актывістка Руху «За Свабоду» Галіна Міхнюк атрымала адказ з Адміністрацыі прэзідэнта на свой электронны зварот да кіраўніка дзяржавы, у якім яна задала яму шэраг пытанняў датычна ініцыятывы «Народны рэферэндум».**

Падставай для напісання Галінай Міхнюк ліста Аляксандру Лукашэнку стаў у сваю чаргу калектыўны зварот да яго 50 тысяч грамадзян з просьбай аб прызначэнні рэспубліканскага рэферэндуму па шасці важных пытаннях дзяржаўнага і грамадскага жыцця - ад медыцыны да еўраінтэграцыі.

Актывістка Руху «За Свабоду» запыталася:

«1) Чаму няма афіцыйнага публічнага адказу Прэзідэнта на пісьмовы зварот да яго 50 тысяч грамадзян Беларусі?

2) Якім быў непублічны адказ Прэзідэнта 50 тысячам грамадзян, якія падпісалі зварот аб прызначэнні рэспубліканскага рэферэндуму па шасці пытаннях?

3) Чаму такія рашэнні, як парушэнне нейтральнага статусу Беларусі знаходжаннем на нашай тэрыторыі расійскіх вайскоўцаў з іх ваеннымі аб'ектамі, як сяброўства Беларусі ў Еўразійскім эканамічным саюзе, прынятыя без уліку маёй па гэтых пытаннях думкі, гэтак як і без уліку меркавання іншых грамадзян?»

Вось поўны адказ з Адміністрацыі прэзідэнта, у прыватнасці, з яе галоўнага ўпраўлення па працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асобаў:

«Тлумачым, што ў адпаведнасці з артыкулам 74 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскія рэферэндумы могуць быць прызначаныя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь толькі па прапанове не менш як 450 тысяч грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам, у тым ліку не менш за 30 тысяч грамадзян ад кожнай з абласцей і горада Мінска.

Прэзідэнт увасабляе адзінства народа, гарантуе рэалізацыю асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі, прадстаўляе Рэспубліку Беларусь у адносінах з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі, прымае меры па ахове суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці, забяспечвае палітычную і эканамічную стабільнасць, пераемнасць і ўзаемадзеянне органаў дзяржаўнай улады, ажыццяўляе пасрэдніцтва паміж органамі дзяржаўнай улады».

Намеснік старшыні Руху «За Свабоду», палітолаг Алесь Лагвінец, каментуючы адказ з Адміністрацыі прэзідэнта, адзначыў:

«З аднаго боку, чыноўнікі запрашаюць сабраць 450 тысяч подпісаў і намякаюць, што тады можна падтрымаць ідэю »Народнага рэферэндуму«. З іншага боку, сцвярджаецца, што »рэферэндумы могуць быць прызначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусі толькі па прапанове не менш як 450 тысяч грамадзян«. Тут можна ўбачыць нават фронду, бо вынікае, што рэферэндум не можа быць ініцыяваны ані прэзідэнтам, ані парламентам. Таму такі адказ можна інтэрпрэтаваць як запрашэнне да большай актыўнасці і ўздзеяння на ўлады».

Юрась Губарэвіч, першы намеснік Руху «За Свабоду», паведаміў, што ў падтрымку «Народнага рэферэндуму» сабрана ўжо 100 тысяч подпісаў грамадзян. Ён таксама звярнуў увагу на адсутнасць адказу з Адміністрацыі прэзідэнта на вострае трэцяе пытанне спадарыні Міхнюк.

Што тычыцца юрыдычных нюансаў у справе ініцыявання і прызначэння рэферэндуму:

«Скептыкі ды праціўнікі »Народнага рэферэндуму» і раней закідалі, што яго правядзенне ў Беларусі немагчымае. Паводле Выбарчага кодэксу, для абвяшчэння рэферэндуму неабходныя подпісы 450 тысяч грамадзян, прычым сабраць іх трэба за кароткі тэрмін - цягам двух месяцаў. А яшчэ трэба, каб улада зацвердзіла пытанні і прызначыла рэферэндум...




Так, мы не рэгістравалі ініцыятыўную групу, каб збіраць подпісы за правядзенне рэферэндуму. Аднак і ў абсалютна неправавой дзяржаве ёсць механізмы ўплыву на ўладу, каб рэферендум аб мірных пераменах адбыўся!

Стаўка зроблена на пастаяннае падвышэнне ўзроўню падтрымкі грамадствам «Народнага рэферэндуму». Мы даможамся рэферэндуму калі не паводле літары закону, дык дзякуючы духу закону! Мы маем 100 тысяч подпісаў, а будзем мець і 200 тысяч, і паўмільёна!

Разам з тым падкрэслю: подпісы ў падтрымку рэферэндуму збіраюцца ў адпаведнасці з законам «Аб зваротах грамадзян». І на калектыўныя звароты з 30 і болей подпісамі грамадзян Адміністрацыя прэзідэнта і Палата прадстаўнікоў павінны паводле заканадаўства як мінімум даць адказы. Пакуль улады адказваюць адмоўна, ігнаруючы волю дзясяткаў тысяч беларусаў да мірных пераменаў і правакуючы сацыяльна-палітычную напружанасць».

Галіна Міхнюк не задаволілася адказам з прэзідэнтуры і напісала туды наноў, настойваючы на адказах на свае пытанні. Ейны аргумент: «Было б лагічна рэферэндумам высветліць, у якім кірунку Прэзідэнту адзінства народа ўвасабляць».

Які адказ прыйшоў? Пацвярджаем, маўляў, папярэдні адказ… На адпісках улада не аднаго сабаку з'ела…

У сваю чаргу два актывісты Руху «За Свабоду» атрымалі адказ з Палаты прадстаўнікоў на заклік ініцыяваць прызначэнне рэферэндуму. Дэпутаты праігнаравалі гэтую прапанову.

Зварот быў разгледжаны ў пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце, адзначаецца ў адказах актывістам Руху Лідзіі Падвойскай і Аляксандру Баганёву за подпісам старшыні камісіі Генадзя Грыцкевіча.

На меркаванне дэпутатаў, нагоды для прызначэння рэферэндуму няма. Па-першае, няма сабраных 450 тысячаў подпісаў і зарэгістраваных ініцыятыўных групаў. Па-другое, хаця рэферэндум можа быць ініцыяваны з дапамогай звароту дэпутатаў да кіраўніка краіны (менавіта па гэтай схеме і ідзе збор подпісаў у падтрымку «Народнага рэферэндуму»), але ў Палаце прадстаўнікоў не палічылі неабходным пайсці на такі крок.

«Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў не падтрымалі прапанову аб уключэнні ў парадак дня сесіі і разглядзе на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў пытання аб правядзення рэспубліканскага рэферэндуму», - адзначана ў адказе.

Пры гэтым, «іншымі суб'ектамі права заканадаўчай ініцыятывы такая прапанова не выносілася», таму «падставы для ўключэння ў парадак дня сесіі Палаты прадстаўнікоў і разгляду прапановы аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму адсутнічаюць».

**Шэсць пытанняў «Народнага рэферэндуму»:**

1. Ці згодныя вы, што ў дзяржаўных установах адукацыі і аховы здароўя ўсе паслугі грамадзянам Беларусі павінны аказвацца бясплатна?
2. Ці згодныя вы, што кіраўнікі выканкамаў гарадоў, раёнаў, абласцей павінны абірацца прамым галасаваннем грамадзян?
3. Ці падтрымліваеце вы курс на эканамічную інтэграцыю, асацыяцыю і стварэнне бязвізавай прасторы з Еўрапейскім Саюзам?
4. Ці згодныя вы, што дзеля забеспячэння нейтральнага статусу Беларусі ў краіне павінна быць забаронена размяшчэнне замежных вайсковых аб'ектаў, ядзернай зброі, а беларускія вайскоўцы не мусяць несці службу за мяжой?
5. Ці згодныя вы, што адна і тая ж асоба не можа займаць пасаду прэзідэнта больш за два тэрміны?
6. Ці згодныя вы, што грошы, атрыманыя ад запланаванай урадам прыватызацыі, у першую чаргу павінны пайсці на кампенсацыю ўкладаў, згубленых пад час дэвальвацыі-2011, і стварэнне працоўных месцаў?

«У Палаце прадстаўнікоў прадэманстравалі брак палітычнай адказнасці. Ад бесхрыбетных дэпутатаў, па сутнасці, няма чаго чакаць. Яны грэбуюць законам »Аб зваротах грамадзянаў«, больш за тое яны не ўказалі, у якім фармаце было галасаванне пра ўключэнне ў парадак дня сесіі. У самім парадку дня пытання гэтага не было», - пракаментаваў адказ-адмову намеснік старшыні Руху «За Свабоду» Алесь Лагвінец.

# Шлях да Еўропы:

## з чаго пачаць?

**У шэрагу гарадоў – ад Ліды да Шаркаўшчыны – прайшлі грамадскія слуханні пра перспектывы еўраінтэграцыі Беларусі. Гэта адно з пытанняў «Народнага рэферэндуму». Яно гучыць так: «Ці падтрымліваеце вы курс на эканамічную інтэграцыю, асацыяцыю і стварэнне бязвізавай прасторы з Еўрапейскім Саюзам?».**

Экспертам на слуханнях выступіў намеснік старшыні Руху «За Свабоду», палітолаг Алесь Лагвінец.

Ён распавёў, што грамадзяне Беларусі з'яўляюцца лідарамі па атрыманні Шэнгенскіх візаў на 1000 чалавек. Тым не менш, кошт гэтай візы для нас з'яўляецца надта высокім і складае 60 еўра. Расіяне і ўкраінцы плацяць за яе амаль у два разы менш.

Беларускія ўлады спрабуюць давесці насельніцтву, што віна ляжыць цалкам на еўрапейскім баку. Але на самай справе гэта не так.

Але што грамадскасць можа памяняць у гэтай справе, калі яна не ўплывае на прыняцце важных рашэнняў у краіне? Па словах Лагвінца, калі дзейнічаць, то шанец памяняць сітуацыю ёсць. Вядома, лягчэй за ўсё казаць, што ў нас усё кепска і нічога не рабіць, але ж тады нічога і не зменіцца.

«Любая ўлада спрабуе захавацца. І для таго, каб захавацца, нешта для людзей яна будзе рабіць. Пытанне толькі, што людзі чакаюць ад гэтай улады», – адзначыў Алесь Лагвінец і ў якасці прыклада прывёў выпадак, калі ўлада наважвалася браць па сто долараў за выезд за мяжу. Тады гэта выклікала вялікае абурэнне ў грамадстве - і гэта ініцыятыва не была прынятая.

На думку аднаго з кіраўнікоў Руху, асацыяцыя з ЕС - гэта выключны шанец для нашай краіны, каб пабудаваць годнае жыццё і вырагаваць эканоміку. Менавіта ўзаемадзеянне з аб'яднанай Еўропай (а не вымольванне чарговай кабалы ад Крамля!) стварае рэальныя магчымасці для беларусаў, каб пераняць лепшае і зрабіць так, каб яно запрацавала на нашай глебе.



Дамова аб асацыяцыі для краінаў Усходняга партнёрства прадугледжвае увядзенне больш як 350 прававых нормаў ЕС цягам 10 год. Яна складаецца з некалькіх раздзелаў: палітычнае ўзаемадзеянне; супрацоўніцтва ў сферы ўнутраных справаў і пабудовы дзяржавы права; крокаў па стварэнні паглыбленай і ўсебаковай зоны вольнага гандлю; шырокага супрацоўніцтва ў галіне навукі, аховы навакольнага асяроддзя, транспартных сетак, энергетыкі і адукацыі.

10 год, каб увесці еўрапейскія стандарты ў ключавых для жыцця і будучыні краіны сферах, - гэтага дастаткова. Еўрасаюз гатовы нам дапамагаць, але толькі тады, калі мы найперш будзем самі рупіцца.

Як дзейнічаць? З чаго пачаць? Некаторыя прапановы былі агучаныя на слуханнях:

- Патрабаваць вызваленння палітвязняў і спынення палітычных рэпрэсіяў, праяўляць сваю салідарнасць з тымі, каго пераследуе дзяржава;
- Падпісвацца і самім далучыцца да збору подпісаў за «Народны рэфэрэндум»;
- Ціснуць на ўлады, каб тыя як найхутчэй увялі ў дзеянне Дамовы аб малым памежным руху з Літвой і Польшчай;
- Патрабаваць праз пісьмовыя звароты ад МЗСу не выдумляць розных адгаворак ды як найхутчэй падпісаць пагадненне аб спрошчаным візавым рэжыме з ЕС, адмяніўшы ў аднабаковым парадку візы для грамадзянаў ЕС і шэрагу іншых краінаў;
- Закідаць лістамі Савет міністраў, каб той адмяніў сваю дыскрымінацыйную пастанову № 1554 ад 18.11.2011, якая абмяжоўвае права беларусаў на выезд за мяжу на сваім аўтамабілі не часцей за 8 дзён, а ў сённяшніх варунках, права на выжыванне ва ўмовах эканамічнага крызісу, асабліва для жыхароў памежных рэгіёнаў;
- Патрабаваць, каб была неадкладна была прынятая дзяржаўная праграма аб абсталяванні ўсіх памежных пераходаў зручнасцямі для пешаходаў і раварыстаў;

«Размова вядзецца толькі пра першыя найбольш відавочныя крокі, якія маюць на мэце паказаць беларусам і нашым еўрапейскім партнёрам, што наш патэнцыял паляпшэння стасункаў з аб'яднанай Еўропай пачынае выкарыстоўвацца», - кажа Алесь Лагвінец.

# Мілінкевіч: Патрэбна нацыянальнае яднанне

**18 сакавіка беларуская дэмакратычная супольнасць упершыню атрымала магчымасць выступіць на пленарным пасяджэнні Парламенцкай асамблеі Еўранэсту, якая праходзіць у Ерэване.**

Агульную пазіцыю дэлегацыі беларускай апазіцыі прадставіў старшыня Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч. «Дэмакратыя абавязкова прыйдзе, але сёння для нас галоўнае - абараніць незалежнасць, бо яе можна страціць за адну ноч, і тады не будзе ні свабоды, ні правоў чалавека, ні Радзімы», - сказаў ён, адзначыўшы, што «што толькі паступовая еўраінтэграцыя дае нам шанец на захаванне Беларусі».

Дэмакратыяныя сілы, па ягоных словах, выступаюць за дыялог унутры краіны: «За тое, каб палітычная дыскусія перш за ўсе вялася не на вуліцах і плошчах, а ў міжнародна прызнаным беларускім парламенце». «Ва ўмовах пагрозы агрэсіі з боку Расіі нам неабходнае нацыянальнае яднанне», - сказаў Мілінкевіч.

«Могуць быць цыклы прагрэсу і рэгрэсу, але Еўропа не павінна казаць: »Не хочаце з намі - да пабачэння!« Трэба спрыяць лібералізацыі і росту еўрааптымізму як грамадзянаў, так і ўладаў нашай краіны. Найважнейшае - захаваць тут »смак Еўропы«!» – заявіў Мілінкевіч.

«Дыялог мае дапамагчы правесці ў Беларуси сумленныя выбары. Нам вельмі важна, каб беларускія парламентарыі як роўныя з роўнымі былі прадстаўлены ў Еуранэсце. Сёння мы прапануем кампрамісны варыянт »5+5« (палова дэлегацыі - ад Палаты прадстаўнікоў, палова - ад грамадзянскай супольнасці). Маем надзею, што выбары ў наш парламент 2016 году пройдуць ужо адкрыта, справядліва, мы палічым галасы разам з уладай - у гэтай зале Беларусь стане прадстаўляць паўнавартасная дэлегацыя», - сказаў старшыня Руху «За Свабоду».



«Мы таксама вітаем запрашэнне афіцыйнай беларускай дэлегацыі на Рыжскі саміт Усходняга партнёрства ў траўні, аднак лічым, што на ім павінен быць пачуты таксама голас грамадзянскай супольнасці і палітычнай апазіцыі», - сказаў Мілінкевіч.

Разам з тым прарыў у адносінах Беларусі з Захадам немагчымы без палітычнай І эканамічнай лібералізацыі нягледзячы на спрыяльную для гэтага геапалітычную сітуацыю, перакананы палітолаг, намеснік старшыні Руху «За Свабоду» Алесь Лагвінец.

Серыя візітаў у Мінск высокапастаўленых заходніх палітыкаў і чыноўнікаў у канцы лютага не з’яўляецца сведчаннем або прадвеснікам якога-небудзь прарыву ў адносінах Беларусі з ЕС і ЗША. Гаворка можа ісці толькі аб некаторым ўмацаванні знешнепалітычных пазіцый беларускіх уладаў.

«Прарыву няма, і я сумняюся, што пры сённяшніх уладах ён магчымы, паколькі яны ўсё-такі ўспрымаюць Захад як ворага. Аднак могуць быць пашыраныя падставы для супрацоўніцтва, яны могуць стаць больш трывалымі, тым больш што Беларусь адназначна не выкарыстоўвае свой патэнцыял стасункаў з заходнімі краінамі. Галоўная прычына, зразумела, заключаецца ў самой прыродзе палітычнага ладу, нежаданні супрацоўнічаць паводле прызнаных на Захадзе правілах і каштоўнасцях», - адзначыў Лагвінец у інтэрв’ю газеце «Беларусы і рынак».

На яго думку, «прарыў мог быць толькі ў тым выпадку, калі б у Беларусі сапраўды пачалася лібералізацыя - як эканамічная, так і палітычная». Пры гэтым знешнія абставіны сёння адназначна спрыяюць наладжванню адносін паміж Беларуссю і заходнімі краінамі: «Сёння ў Захаду сур’ёзную занепакоенасць выклікае палітыка Крамля, тое, што Расея зрабіла ва Украіне».

Аднак гэта зусім не значыць, што ЕС і ЗША гатовыя сёння адмовіцца ад сваіх патрабаванняў да афіцыйнага Мінска і заплюшчыць вочы на парушэнні правоў чалавека ў Беларусі. «Мне здаецца, што Захад не настолькі слабы і запалоханы, каб цалкам згаджацца на тое, што прапануе Лукашэнка. Таму пытанні, якія раней былі ў парадку дня, па-ранейшаму будуць заставацца: вызваленне палітвязняў, палітычныя свабоды, дэмакратычныя выбары і т. д.», - канстатуе намеснік старшыні Руху.

# Дзяржава для народа?

**Яшчэ адна крызісная праява ў беларускай эканоміцы! З’явілася інфармацыя, што Мінскі аўтамабільны завод спыняе свой галоўны канвеер на 10 дзён.**

Рабочых адпраўяць у вымушаныя адпачынкі, заробак, і без таго змізарнелы, ім захаваюць на дзве траціны. Якое прадпрыемства будзе наступным?




Між тым у краіне ўсчалася хваля скарачэнняў працоўных, якіх праз пэўны час могуць запісаць у «дармаеды».

Рух «За Свабоду» лічыць:

«Абвешчаная мадэрнізацыя не дае і не прынясе чаканых вынікаў, бо трэба мяняць структуру эканомікі і форму ўласнасці. Цяпер, па сутнасці, мы бачым толькі выдаткоўванне грошай у новыя станкі ды патрабаванні прыгоннай дысцыпліны. Гэта псеўдамадэрнізацыя і застой, а не развіццё!

На пачатку 1990 гадоў у Беларусі былі адны з найлепшых шанцаў з усіх краінаў былога СССР, каб правесці паспяховае рэфармаванне сваёй гаспадаркі і інтэграваць яе ў сусветную эканоміку. Беларусь мела добрую базу як высокаіндустрыялізаваная дзяржава з дастаткова адукаванай і кваліфікаванай працоўнай сілай. На вялікі жаль, гэтыя шанцы былі змарнаваныя.

25 год таму жыхары суседняй Польшчы, крамы якой зіхацелі пустэчай, скуплялі ў Беларусі самыя розныя тавары. Сёння ўсё наадварот: беларусы дзясяткамі тысяч едуць у Беласток, Тэрэспаль ці Варшаву, каб набыць больш танныя прадукты, вопратку ці бытавую тэхніку. Простыя лічбы: Польшча купляе газ па 330 долараў за кубаметр, Беларусь – па 134. Сярэдні (налічаны) заробак палякаў складае 1090 долараў, а беларусаў – 410.

Дыягназ відавочны: сённяшняя эканамічная мадэль няздольная гарантаваць нашым людзям дабрабыт і ўпэўненасць у заўтрашнім дні».

Газета выдаецца Рухам «За Свабоду». Наклад 299 ас. Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі бясплатна.
Падпісана ў друк 15.04.2015 г. Кантакты рэдакцыі: тэлефон +375 17 2808863, e-пошта info@pyx.by